(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 94:133.4(476.2)"19/20"

Ганчар Уладзімір Алегавіч

# ЭВАЛЮЦЫЯ ЗНАХАРСТВА Ў БЕЛАРУСКІМ ПАЛЕССІ Ў XX – ПАЧАТКУ XXI СТ.

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

Мінск, 2013

**Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце**

Навуковы кіраўнік: **Піліпенка Міхаіл Фёдаравіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»

Афіцыйныя апаненты: **Валодзіна Таццяна Васільеўна**, доктар філалагічных навук, дацэнт, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»

**Якубінская Алеся Дзмітрыеўна**, кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык кафедры гісторыі, сусветнай і мастацкай культуры Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта

Апаніруючая арганізацыя: **Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

Абарона адбудзецца 11 ліпеня 2013 г. у 13.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры дзяржаўнай навуковай установе «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, к. 2, п. 302; тэлефон вучонага сакратара: 284 29 24; e-mail: a_hurko@basnet.by).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

Аўтарэферат разасланы __5__ чэрвеня 2013 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук, дацэнт Г.І. Каспяровіч

# УВОДЗІНЫ

Вывучэнне працэсу эвалюцыі традыцыйнай культуры – адзін з прыярытэтных кірункаў сучаснай беларускай этналагічнай навукі. Часткай традыцыйнай культуры Беларускага Палесся з'яўляецца знахарства. Эвалюцыя знахарства Беларускага Палесся да гэтага часу не была прадметам спецыяльнага даследавання. У публікацыях аб знахарстве характарызуецца пераважна яго функцыянаванне ў XIX – пачатку XX ст. і зусім не разглядаюцца значныя змены, якія адбыліся ў знахарстве ў XX – пачатку XXI ст.

Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць перыяд XX – пачатку XXI ст. Ніжняя мяжа (пачатак XX ст.) тлумачыцца пачаткам змяненняў у знахарстве вывучаемага рэгіёна. Верхняя мяжа (пачатак XXI ст.) абумоўлена функцыянаваннем знахарства ва ўмовах сучаснага грамадства.

Важнейшымі крыніцамі па згаданай тэме з'яўляюцца матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў, сабраныя асабіста аўтарам дысертацыі з 2004 г. па 2011 г. на тэрыторыі Беларускага Палесся.

Падчас напісання дысертацыі прыменены метады палявых этнаграфічных даследаванняў: апытанне, уключанае назіранне, анкетаванне, а для аналізу атрыманых матэрыялаў выкарыстаны гістарычна-генетычны, гістарычна-параўнальны, структурны, функцыянальны, тыпалагічны метады і метад колькаснага аналізу.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Тэма дысертацыі распрацавана ў адпаведнасці з дзяржаўнай комплекснай праграмай фундаментальных навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры», задання гэтай праграмы: «Традыцыі народнай культуры этнічных супольнасцей Беларусі: гісторыя, сучасны стан і перспектывы развіцця» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20061100).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта даследавання* – прасачыць эвалюцыю знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст.

Для дасягнення пастаўленай мэты вызначаны наступныя навуковыя *задачы*:

1. Выявіць змены тыпаў знахароў у Беларускім Палессі ў XX – пачатку XXI ст.

2. Раскрыць эвалюцыю характэрных рысаў носьбітаў знахарскіх уяўленняў.

3. Вызначыць змены функцый знахароў у XX – пачатку XXI ст.

4. Прасачыць эвалюцыю структуры знахарскай практыкі.

5. Разгледзець змяненне кампанентаў знахарскай практыкі.

6. Вылучыць этапы эвалюцыі знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

*Аб'ектам* даследавання з'яўляецца палескі субэтнас беларускага этнасу. Прадметам даследавання – эвалюцыя традыцыйнага знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. У першай трэці XX ст. у Беларускім Палессі існавалі два асноўныя тыпы знахароў: «*шаптуны*» і «*знахары*», якія адрозніваліся паміж сабой уяўленнямі аб паходжанні магічнай сілы, функцыямі. Іншыя назвы, якія выкарыстоўвалі для абазначэння носьбітаў знахарскіх уяўленняў, удакладнялі і характарызавалі накіраванасць знахарскай дзейнасці і яе спецыялізацыю, а таксама рэпутацыю знахароў. У 1930–1980-я гг. адбыліся значныя змены тыпаў знахароў. Знікае адзін з тыпаў носьбітаў знахарскіх уяўленняў – «*знахары*». У канцы XX – пачатку XXI ст. знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся прадстаўлена пераважна «*шаптунамі*». Сярод насельніцтва, асабліва моладзі і людзей сярэдняга ўзросту, шырока распаўсюдзіліся погляды на знахароў у межах дуалістычнага падыходу – «знахар – калдун». Для характарыстыкі носьбітаў знахарскіх уяўленняў узніклі і распаўсюдзіліся новыя назвы («калдун», «гадалка»). У дысертацыі ўпершыню распрацавана тыпалогія знахароў Беларускага Палесся і выяўлены зменых іх тыпаў.

2. У 1900–1920-я гг. знахарамі на тэрыторыі Беларускага Палесся традыцыйна былі прадстаўнікі абодвух палоў пераважна сталага ўзросту. Пры гэтым большасць «*шаптуноў*» былі жанчынамі. «*Знахарамі*» пераважна з'яўляліся мужчыны. У сваіх паводзінах знахары кіраваліся комплексам нормаў, якія, з аднаго боку, былі накіраваны на захаванне эзатэрычнага характару знахарскіх уяўленняў, а з другога боку, гарантавалі іх перадачу наступным пакаленням. У выніку эвалюцыі знахарства ў Беларускім Палессі ў 1930–1980-я гг. адбыліся змены характэрных рысаў знахароў, скарацілася іх колькасць. Сучасныя носьбіты знахарскіх уяўленняў у дадзеным рэгіёне

прадстаўлены ў асноўным жанчынамі сталага ўзросту. Матэрыялы канца XX – пачатку XXI ст. сведчаць аб павелічэнні ўплыву хрысціянства на светапогляд знахароў. Змяненне характэрных рысаў знахароў раскрываеца ў дысертацыі ўпершыню.

3. У першай трэці XX ст. функцыі двух тыпаў знахароў адрозніваліся. «*Шаптуны*», як правіла, лячылі розныя хваробы людзей і жывёлы, якія згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі былі вынікам інфекцый, траўматызму ці ненаўмыснага чараўніцтва. Асноўнымі функцыямі «*знахароў*» з'яўляліся магічнае ўздзеянне на навакольны свет і соцыум у станоўчым і адмоўным кірунках і варажба. У 1930–1980-я гг. знахарскія функцыі змяняюцца. Знікла большасць кірункаў знахарскай дзейнасці, у прыватнасці тых, што знаходзіліся ў кампетэнцыі «*знахароў*». «*Шаптуны*» захавалі пэўную частку сваіх функцый. У асноўным гэта лячэнне людзей і жывёлы ад хвароб, якое, на думку часткі насельніцтва, не можа быць рэалізавана іншымі асобамі ці ўстановамі. Асноўныя знахарскія функцыі і іх эвалюцыя ў XX – пачатку XXI ст. вызначаны ўпершыню.

4. У структуры знахарскай дзейнасці на тэрыторыі Беларускага Палесся ў першай трэці XX ст. вылучаецца некалькі элементаў: матывацыя дзейнасці, вызначэнне крыніцы праблемы (варажба), выбар часу, месца знахарскага абраду; непасрэдна сам абрад; аплата знахарскай практыкі. У 1930–1980-я гг. структура знахарскай дзейнасці захавалася, аднак змяніліся асобныя элементы гэтай структуры. У другой палавіне XX ст. на структуру знахарскай практыкі павялічыўся ўплыў хрысціянства. У той жа час на тэрыторыі Беларускага Палесся працягваюць існаваць некаторыя лакальныя адрозненні ў знахарскай практыцы, у прыватнасці, у назвах хвароб, спосабах лячэння. Эвалюцыя структуры знахарскай дзейнасці прасочана ўпершыню.

5. Знахарская практыка традыцыйна ўключала тры асноўныя кампаненты: вербальны, акцыянальны і прадметны. У выніку яе эвалюцыі ў XX ст. узмацнілася роля вербальнага кампанента, асабліва замоў і зменшылася значэнне акцыянальнага і прадметнага кампанентаў. Павялічылася роля хрысціянскай атрыбутыкі. Змяненне кампанентаў знахарскай практыкі разгледжана ўпершыню.

6. У эвалюцыі знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст. вылучаецца тры этапы. Першы этап ахоплівае 1900–1920-я гг., калі пачынаюцца змены знахарства пад уплывам адукацыі. Другі этап закранае 1930-я – першую палавіну 1980-х гг. У гэты час скарачаецца колькасць носьбітаў знахарскіх уяўленняў, знікаюць некаторыя тыпы знахароў, звужаецца сфера функцыянавання знахарства, назіраюцца змены ў структуры і кампанетах знахарскай практыкі. Эвалюцыя знахарства на гэтым этапе абумоўліваецца

маштабнымі пераўтварэннямі ў грамадстве, пераходам да калектыўных формаў гаспадарання, урбанізацыяй, пашырэннем адукацыі, стварэннем шырокай сеткі медыцынскіх устаноў. Трэці этап ахоплівае другую палавіну 1980-х гг. – пачатак XXI ст. На гэтым этапе знахарства прадстаўлена адным тыпам знахароў – «*шаптунамі*». Асноўнай знахарскай функцыяй з'яўляецца лячэнне. Этапы эвалюцыі знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся вылучаны ўпершыню.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дадзеная дысертацыйная работа з'яўляецца самастойным даследаваннем, выкананым на аснове палявых этнаграфічных матэрыялаў аўтара, сабраных у этнаграфічных экспедыцыях на тэрыторыі Беларускага Палесся ў 2004–2011 гг.

У працы ўпершыню разгледжана эвалюцыя традыцыйнага знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст., выяўлены змены тыпаў знахароў, характэрных рысаў носьбітаў знахарскіх уяўленняў, асноўных відаў знахарскай дзейнасці, структуры і кампанентаў знахарскай практыкі. Таксама ўпершыню раскрыты прычыны зменаў знахарства Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст., вылучаны асноўныя этапы гэтага працэсу.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні дысертацыі апрабаваны на наступных навуковых канферэнцыях: Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй (да 450-годдзя г. Століна)» (Столін, 28–29 верасня 2005 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Открыть миру душу белоруса...» (Гомель, 25–26 кастрычніка 2005 г.), II Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся» (Гомель, 27–28 красавіка 2006 г.), Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Сучасны гісторыка-культурны працэс: самавызначэнне і самарэалізацыя суб'екта» (Мінск, 16–17 мая 2006 г.), VIII Рэспубліканскай міжвузаўскай навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных (Брэст, 19 мая 2006 г.), Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, 27 сакавіка 2007 г.), IX Рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных (Брэст, 18 мая 2007 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Романовские чтения IV» (Магілёў, 22–23 лістапада 2007 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Праблемы вывучэння культурных сувязей на этнакантактных тэрыторыях у славянскіх свеце» (Мінск, 22–23 мая 2008 г.), XI Рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных (Брэст, 15 мая 2009 г.), III Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся» (Гомель, 21–22 мая 2009 г.), Міжнароднай навукова-

практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучаснае становішча культуры і мастацтваў» (Мінск, 24–25 верасня 2009 г.), Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX ст. Этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы» (Гомель, 1–2 кастрычніка 2009 г.), XII Рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных (Брэст, 14 мая 2010 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI вв.» (Мінск, 19–20 мая 2010 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Нацыянальная культура і мастацтва Беларусі ў еўрапейскім кантэксце» (Мінск, 18–19 лістапада 2010 г.).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Вынікі даследавання былі апублікаваны ў 5 артыкулах у рэцэнзуемых выданнях, уключаных у спіс Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь і ў 14 артыкулах у іншых выданнях. Агульны аб'ём артыкулаў у навуковых выданнях, уключаных ВАК у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, – 2,6 аўтарскія аркушы.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу. Аб'ём тэкставай часткі – 112 старонак, агульны аб'ём – 128 старонак. Бібліяграфічны спіс разам з публікацыямі саіскальніка складае 154 назвы.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў**

Матэрыялы і вынікі дысертацыі выкарыстаны ў лекцыйным курсе «Этналогія і этнаграфія Беларусі» для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, спецыяльным курсе «Традыцыйная духоўная культура беларусаў» для студэнтаў 4 курса гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама ў лекцыйным курсе «Этнаграфія і этналогія Беларусі» для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны».

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны для напісання абагульняючых навуковых прац па традыцыйнай культуры беларусаў. Матэрыялы даследавання могуць быць прыменены для распрацоўкі спецкурсаў па беларускай этналогіі.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ

**Артыкулы ў рэцэнзуемых выданнях, уключаных у спіс вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь**

1–А. Ганчар, У.А. Аб адным спосабе лячэння крыксаў у знахарскай практыцы беларусаў Усходняга Палесся / У.А. Ганчар // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, ДНУ «Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы» ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2009. – Вып. 6. – С. 330–334.

2–А. Ганчар, У.А. Варажба ў сучаснай знахарскай практыцы Беларускага Палесся / У.А. Ганчар // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, ДНУ «Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы» ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2010. – Вып. 8. – С. 300–307.

3–А. Ганчар, У.А. Тыпы «*знаючых*» у Беларускім Палессі і іх змены ў XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // Весці Палесскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сер. грамад. і гуманітар. навук. – 2011. – № 1. – С. 20–26.

4–А. Ганчар, У.А. Змены рысаў «знаючых людзей» на тэрыторыі Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы» ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2011. – Вып. 10. – С. 317–322.

5–А. Ганчар, У.А. Накірункі знахарскай дзейнасці ў Беларускім Палессі і іх змены ў XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // Научные труды Республиканского института высшей школы : в 2 ч. : сб. науч. ст. / под ред. В.Ф. Беркова. – Минск : РИВШ, 2011. – Вып. 11, ч. 1 : Исторические и педагогические науки. – С. 24–30.

**Матэрыялы канферэнцый**

6–А. Ганчар, У.А. Працэс вызначэння дыягназу пацыента ў сучаснай знахарскай практыцы Беларускага Падняпроўя / У.А. Ганчар // Романовские чтения – III: сб. тр. Междунар. науч. конф., 23-24 ноября 2006 г., Могилев / редсовет: М.И. Вишневский (председатель) [и др.]. – Могилев : МГУ, 2007. – С. 121–123.

7–А. Ганчар, У.А. Аб адным нетыповым спосабе лячэння ў сучаснай знахарскай практыцы Беларускага Палесся / У.А. Ганчар // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і

захавання ў постчарнобыльскі час : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны», Навук.-даслед. ін-т гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў пры ГДУ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – Вып. 2. – С. 32–34.

8–А. Ганчар, У.А. Атрыманне знахарскіх ведаў у сне ў беларусаў Палесся ў XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : зб. навук. арт. : у 2 ч. / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны» ; рэдкал.: В.А. Міхедзька (адказ. рэда.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ, 2009. – Ч. 2. – 2009. – С. 21–29.

9–А. Ганчар, У.А. Знахар у сучаснай беларускай вёсцы: самавызначэнне і самарэалізацыя асобы / У.А. Ганчар // Сучасны гісторыка-культурны працэс: самавызначэнне і самарэалізацыя суб'екта : матэрыялы Рэсп. навук. канф., г. Мінск, 16–17 мая 2006 г. / рэдкал.: А.У. Рагуля (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2006. – С. 98–100.

10–А. Ганчар, У.А. Знахарская практыка пры першым выгане жывёлы ў Беларускім Палессі ў XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // XII республиканская научно-методическая конференция молодых ученых : сб. материалов, Брест, 14 мая 2010 г. : в 2 ч. / М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. ун-т им. А.С. Пушкина ; / под общ. ред. С.А. Марзана. – Брест : Изд-во БрГУ, 2010. – Ч. 1. – с. 13–15.

11–А. Ганчар, У.А. Лячэнне ад змяіных укусаў і яго вытокі ў сучаснай знахарскай практыцы беларусаў / У.А. Ганчар // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : материалы Междунар. науч.-теорет. конф., г. Минск, 27 апр. 2007 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол: В.В. Тугай (отв ред) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2007. – С. 326–328.

12–А. Ганчар, У.А. Лячэнне «на ваду» ў сучаснай знахарскай практыцы беларусаў / У.А. Ганчар // VIII Республиканская межвузовская научно-методическая конференция молодых ученых : сб. материалов, 19 мая 2006 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. ун-т им. А.С. Пушкина ; под общ. ред. Б.М. Лепешко. – Брест : Изд-во БрГУ, 2006. – С. 129–132.

13–А. Ганчар, У.А. Наступствы лячэння і іх ліквідацыя ў сучаснай знахарскай практыцы беларусаў / У.А. Ганчар // IX республиканская научно-методическая конференция молодых ученых : сб. материалов, 18 мая 2007 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. ун-т им. А.С. Пушкина ; под общ. ред. К.К. Красовского. – Брест: Изд-во БрГУ, 2007. – С. 141–143.

14–А. Ганчар, У.А. Наследаванне ведаў у знахарскай практыцы беларусаў на сучасным этапе / У.А. Ганчар // «Открыть миру душу белоруса...» : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 150-годдзю з дня нараджэння Е.Р. Раманава, 25–26 кастр. 2005 г. / рэдкал: А.Р. Яшчанка (адказ. рэд.), А.А. Макушнікаў, В.П. Пічукоў. – Гомель : ГДУ, 2005. – С. 147–151.

15–А. Ганчар, У.А. Рожа і яе лячэнне ў сучаснай знахарскай практыцы беларусаў / У.А. Ганчар // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны», Навук.-даслед. ін-т гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў пры ГДУ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. – С. 133–136.

16–А. Ганчар, У.А. Трансфармацыя знахарскай практыкі лячэння жывёлы ў беларусаў Усходняга Палесся ў XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // XI республиканская научно-методическая конференция молодых ученых : в 2 ч. : сб. материалов, Брест, 15 мая 2009 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. ун-т им. А.С. Пушкина ; под общ. ред. К.К. Красовского. – Брест : Изд-во БрГУ, 2009. – Ч. 2. – С. 76–78.

17–А. Ганчар, У.А. Уяўленні аб паходжанні знахарства ў традыцыйнай культуры беларусаў / У.А. Ганчар // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в. : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 19–20 мая 2010 г. / редкол.: Т.А. Новогродский (ответственный редактор) [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2011. – С. 84–87.

18–А. Ганчар, У.А. Шпіталь як месца знахарскага дзеяння ў беларусаў Падняпроўя і Усходняга Палесся апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. / У.А. Ганчар // Романовские чтения – IV : сб. тр. Междунар. науч. конф., г. Могилев, 22–23 нояб. 2007 года / ред. совет: Я.Г. Риер (председатель) [и др.]. – Могилев : МГУ, 2008. – С. 107–108.

19–А. Гончар, В.О. О лечении, осуществляемом на современном этапе знахарями Западного и Восточного Полесья (по материалам заговоров) / В.О. Гончар // Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй (да 450-годдзя г. Століна) : зб. матэрыялаў міжнар. навук. канф., г. Столін, 28–29 верас. 2005 г. : у 2 ч. / Брэсц. абл. выканкам, Столін. раён. выканкам, Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна; рэдкал.: А.М. Вабішчэвіч [і інш.]. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2006. – Ч. 1. – 2006. – С. 81–86.

# РЭЗЮМЭ

**Ганчар Уладзімір Алегавіч**

**Эвалюцыя традыцыйнага знахарства ў Беларускім Палессі ў XX – пачатку XXI ст.**

**Ключавыя словы:** Беларускае Палессе, эвалюцыя, традыцыйная культура, знахарства, знахарскія ўяўленні, функцыі знахароў, структура і кампаненты знахарскай практыкі, прычыны і этапы эвалюцыі знахарства.

**Мэта даследавання:** прасачыць эвалюцыю знахарства ў Беларускім Палессі ў XX – пачатку XXI ст.

**Метады даследавання:** уключанае назіранне, апытанне, анкетаванне, гістарычна-генетычны, гістарычна-параўнальны, структурны, функцыянальны, тыпалагічны метады, метад колькаснага аналізу.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** у дысертацыі ўпершыню даследавана эвалюцыя традыцыйнага знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст., прасочаны змены тыпаў знахароў, характэрных рысаў носьбітаў знахарскіх уяўленняў, асноўных відаў знахарскай дзейнасці, структуры і кампанентаў знахарскай практыкі. Упершыню выяўлены прычыны эвалюцыі знахарства на тэрыторыі Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст., а таксама вылучаны асноўныя этапы гэтага працэсу.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** Матэрыялы і вынікі дысертацыі выкарыстаныя ў лекцыйным курсе «Этналогія і этнаграфія Беларусі» для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта БДУ, у спецыяльным курсе «Традыцыйная духоўная культура беларусаў» для студэнтаў 4 курса гістарычнага факультэта БДУ, а таксама ў лекцыйным курсе «Этналогія і этнаграфія Беларусі» для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта УА «ГДУ імя Ф. Скарыны». Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны для напісання абагульняючых навуковых манаграфій па традыцыйнай культуры беларусаў, распрацоўкі спецкурсаў па этналогіі Беларусі.

**Галіна выкарыстання:** этналогія, гісторыя Беларусі, гістарычнае краязнаўства.

# РЕЗЮМЕ

**Гончар Владимир Олегович**

**Эволюция традиционного знахарства в Беларуском Полесье в XX - начале XXI в.**

**Ключевые слова:** Белорусское Полесье, эволюция, традиционная культура, знахарство, знахарские представления, функции знахарей, структура и компоненты знахарской практики, причины и этапы эволюции знахарства.

**Цель исследования:** проследить эволюцию знахарства в Белорусском Полесье в XX – начале XXI в.

**Методы исследования:** включенное наблюдение, метод опроса, анкетирование, историко-генетический, историко-сравнительный, структурный, функциональный, типологический методы, метод количественного анализа.

**Полученные итоги и их новизна:** в диссертации впервые исследована эволюция традиционного знахарства на территории Белорусского Полесья в XX – начале XXI в., прослежены изменения типов знахарей, характерных черт носителей знахарских представлений, основных видов знахарской деятельности, структуры и компонентов знахарской практики. Впервые выявлены причины эволюции знахарства на территории Белорусского Полесья в XX – начале XXI в., а также выделены основные этапы этого процесса.

**Рекомендации по использованию:** Материалы и итоги диссертации использованы в лекционном курсе «Этнология и этнография Беларуси» для студентов 1 курса исторического факультета БГУ, специальном курсе «Традиционная духовная культура белорусов» для студентов 4 курса исторического факультета БГУ, а также в лекционном курсе «Этнология и этнография Беларуси» для студентов 1 курса исторического факультета УО «ГГУ им. Ф. Скорины». Результаты исследования могут быть использованы для написания обобщающих научных монографий по традиционной культуре белорусов, разработки спецкурсов по этнологии Беларуси.

**Область применения:** этнология, история Беларуси, историческое краеведение.

# SUMMARY

**Hanchar Uladzimir Alehawich**

## Evolution of traditional witchcraft in Belarusian Polesia In the XX$^{th}$ – the beginning of the XXI$^{th}$ century

**Key words:** Belarusian Polesia, evolution, traditional culture, witchcraft, witch-doctors power, functions of witch-doctors, the structure of witch-d ctors practice, the components of witch-doctors practices, the causes and stages of evolution of witchcraft.

**Purpose of research:** to retrace the evolution of the witchcraft in Belarusian Polesia in the XX$^{th}$ – the beginning of the XXI$^{th}$ century.

**Methods of research:** participant observation, interviewing, questionnaire survey, historiko-genetic, historico-comparative, structural, functional, typological methods, quantitative analysis method.

**Novelty of results:** for the first time in thesis studied the evolution of the traditional witchcraft in Belarusian Polesia in the XX$^{th}$ – the beginning of the XXI$^{th}$ century. Tracked changes in the types of witch-doctors, and their characteristic features, directions of witch-doctors activity, the structure and the components of witch-doctors practices The author first identified the causes of the evolution of the traditional witchcraft in Belarusian Polesia in the XX$^{th}$ – the beginning of the XXI$^{th}$ century, and also defined the main stages of the process.

**Recommendations for use:** Proceedings of the thesis and the results used in the lecture course «Ethnology and ethnography of Belarus» for students of 1$^{st}$ course of historical faculty of BSU, a special course «Traditional spiritual culture of Byelorussians» for students 4$^{th}$ course of historical faculty of BSU, as well as in the lecture course «Ethnology and ethnography of Belarus» for students of 1$^{st}$ course of historical faculty of EE «GSU named by F. Skaryna». The results can be used for a writing of summarizing scientific monographies on the traditional culture of Belarusians. The research materials may be used to develop special courses in ethnology of Belarus.

**Field of application:** ethnology, history of Belarus, local history.